



Будзе магчымасць — абавязкова спытаю ў касманаўтаў, якой яны бачылі нашу Зямлю ў навагоднія святы. Асабліва цікавіць мяне, як выглядае начны Мінск, бо ў гэтыя дні нават міжнародныя тэлеканалы адзначылі надзвычайную прыгажосць нашай сталіцы.

А пакуль што — фотаапарат у рукі і наперад: здыму сам начны партрэт Мінска. Прайдуся па цэнтральных вуліцах. Пагляджу, якззяюць гірлянды, пераліваецца святло на навагодніх ёлках, прывабліваюць яркія рэкламы на вулічных шапіках ды міні-кафэ, зіхацяць іскрынкамі бенгальскія агні.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

# НАВАГОДНЯЕ СВЯТЛО















